**УДК 398.3(476)**

# СОН І БЯССОННЕ У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ КАН. XX – ПАЧ. XXI ст.

***А.С. ВЫСОЦКАЯ***
**Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Наваполацк**

*Улічваючы адлюстраванне парушэнняў сну ў сістэме традыцыйнай медыцыны беларусаў, якія пражываюць у Дзвінскім рэгіёне, можна яшчэ раз убачыць, што ёсць глыбокая ступень захаванасці архаічнага кампанента ў беларускай традыцыйнай культуры. Палявыя этнаграфічныя даследаванні, праведзеныя ў 2000-х гадах на тэрыторыі беларускага Падзвіння, паказваюць, што, нягледзячы на стыхійны працэс урбанізацыі і распаўсюджвання масавай інфармацыі, традыцыйныя міфапаэтычныя уяўленнi працягваюць сваё існаванне. Статус народнай медыцыны сёння значна вышэй для сельскага жыхара, чым сродкаў, якія прапануе афіцыйная медыцына.*

Медыкі, фізіёлагі, псіхолагі і іншыя спецыялісты не могуць канчаткова прыйсці да згоды адносна вызначэння сну як працэсу, яго прычынах, прызначэння сюжэтнасці снабачанняў. З пункту гледжання Фрэйда, сон з'яўляецца вынікам працы псіхалагічнага працэсу, які характарызуецца архаічнымі спосабамі мыслення, у прыватнасці зрушэннем, згушчэннем і замяшчэннем, якія спрыяюць пераходу схаванага зместу ў відавочны сон [7]. Яшчэ Арыстоцель у адным з шэрагу сваіх псіхалагічных трактатаў сцвяржае, што "…фантазія ёсць нейкі рух, які вырабляецца дзеяннем ўспрыняцця; а сон, відаць, ёсць вынік фантазіі; з гэтага ясна, што сон ёсць нейкае дзеянне ўспрыняцця, якое выяўляецца ў сне." [22]. Карл Юнг і іншыя паслядоўнікі фрэйдаўскай тэорыі псіхааналізу называлі сон "царскім шляхам да несвядомага". Магчыма, у адным думкі даследчыкаў сходзяцца – сон ёсць натуральная патрэбная з'ява, без якой немагчыма існаванне чалавека.

У традыцыі нармалёвы сон ёсць індыкат здароўя чалавека: "*Калі дзіця неспакойна варочаецца ў ночы, крычыць, то матка лічыць, што гэта ад перапалэху*" [18, с. 664]. Пераблытаць "ноч з днём" таксама лічылася дрэнным і патрабавала адпаведных дзеянняў: "*Калі дзіцяці спіць толькі днём, а ночу не спіць, хаця б і не з-за хваробы, маці купае яго перад самым захадам сонца і укладвае у калыску ў адных пялюшках, а прыгатаваную рубаху вешае на дзверы уніз каўнерыкам*" [20, с. 28]. Разумеючы натуральную патрэбу чалавечага арганізму ў сне, народная медыцына прапаноўвае шэраг практык па лекаванню бяссонніцы: "*А пустырнік…пі яго і спі спакойна!*" [14, с. 42]. "Добры сон" сам па сабе з'яўляецца сінонімам "добрага здароўя": "*Зорка-зарніца, родная сястрыца, прымі ад гэтага дзіцяці крыксы, плаксы, начніцы, дай яму добрага здароўя і добрага сну*" [15, с. 104]. Вось гэты тандэм "сон-здароўе" сустракаецца даволі часта ў магічнай практыцы народнай медыцыны: "*Пахрышчуся, памалюся Госпаду Богу, Духу Святому…на гэты свет пускайце, сон, здароўе давайце*" [18, с. 433–434]. Раўнавага катэгорыі "добры сон" і катэгорыі "здароўе" прасочваецца і ў сімвалічных прамовах: "*…вот едзеш дзе-небудзь з рабёнкам цераз рэкі. Гэта врадзіць рабёнку ..і тады так: "Ты, вадзіца, як бегла, так і бяжы! А ты – сыночак ці адчушка – як спала, так і спі!"* [15, с. 105] ("спі" – лічы "не хварэй" – *аўт.).* А вяртанне добрага сну азначае вяртанне здаровага стану: "*Тён тры разы выліў, і ўсё. І яна стала спаць нармальна, і ўсё нармальна стала.*" [8]. Бяссонне ў беларускай народнай медыцыне адносіцца да псіханеўралагічных хваробаў, і як і любая хвароба, па сутнасці, азначае адхіленне ад нармальнага стану, гармоніі, раўнавагі [2, с. 530–531]. Пазбаўляюцца бяссонніцы тыповымі і для астатніх хваробаў спосабам вербальнай персаніфікацыі і далейшых вынішчальных дзеянняў: "*– Ты, бяссоніца, не гудзі, маё дзіця не будзі. Хочаш блудзіцца, ідзі к саве-пціцэ, к салаўю-соловушке. З імі гуляй, гульні гуляй, сон младзенцу не пароч, праганю цябе проч. Амінь.*" [4].

Тэматыка сна закранула адзін з самых старажытных жанраў фальклору – замовы. Малітоўныя формулы на добры сон падкрэслівалі важнасць добрага сну для чалавека, бо апелявалі ў іх да вышэйшых сакральных асобаў : "*Спацькі лажуся, на Божаньку здаюся*! [13, с. 113]; а пасылалася бяссонне у самыя далёкія "засветы", у месцы, якія не маюць прыкмет жыцця: "*…нясіце сцежкамі, межамі, па мхам, па балотам, па ніцым лозам, дзе людзі і жывотныя не ходзяць, пціцы не лятаюць, пцічы голас не заходзіць"* [13, с. 104]. Увогуле, замовы-малітвы на сон уяўляюць сабой шырокую группу тэкстаў у шэрагу палявых матэрыялаў, актыўна функцыянуюць у сучаснай традыцыі ў якасці асабістых абярэгаў нараўне з кананічнымі малітвамі, якія хрысціянская традыцыя прапануе чытаць перад сном: *"А вось як спаць кладзёцеся, гаворыце малітвачку якую на сон? – На сон пастаянна адзельная малітва"* [11].

Тыповымі для падзвінскіх замоваў з'яўляюцца вобразы сакральнага заступніка, матыў крыжа, адгону небяспекі; нярэдка назіраецца і жанравае падабенства кананічных і народных малітваў гэтага парадку, што можа быць вызначальнай прыкметай вытокаў апошніх. Асаблівая падрыхтоўка да сну пацвярджае наяўнасць у прадстаўніка традыцыі верванняў пра безабароненнасць спячага чалавека; натуральная і неабходная з'ява ідзе поруч з магчымым пашкоджаннем фізічнага і псіхічнага здароўя. Асаблівую пільнасць, на думку беларусаў Падзвіння, трэба захоўваць у пераломныя кропкі году і сутак (поўдзень і поўнач) [13, с. 24], што пацявярджае ўяўленні аб якаснай неаднароднасці прасторы і часу з пункту гледжання не рэальнай карціны свету, а міфічнай. З'яўленню дэструктыўных сілаў падчас сну садзейнічае як позні час, так неправільныя паводзіны: "*Вясной і летам трэба ўтрымлівацца ад сну на заходзе сонца: тады, хутчэй за ўсё, у безабароненага чалавека ўходзіць ліхаманка, ці чапляецца іншся ўнутраная хвароба*" [19, с. 258]. Такім чынам, акрамя іншых прычын хваробаў, вылучаюцца такія, як час і месца; яны могуць спрыяць узнікненню хваробы ці нават правакаваць яе [1, с. 72]. Да усіх гэтых фактараў далучаецца і безабароненасць чалавека падчас сну.

Са сном звязаны не толькі прафілактычна-засцярагальныя, але і лекавыя замовы, і на тое ёсць свае прычыны. Пра высокую ступень захаванасці архаічнага кампанента ў беларускай народнай медыцыне ўжо неаднаразова пісалі навукоўцы. Сучасныя палявыя этнаграфічныя запісы даюць падставы сцвярджаць, што, нягледзячы на ўрбанізацыйныя працэссы, распаўсюджанне СМІ і інш., узоры народнай медыцыны для традыцыйнага чалавека з'яўляюцца ўплывовымі і аўтарытэтнымі. Больш таго, нярэдка да іх звяртаецца і сучаснае пакаленне як да альтэрнатывы афіцыйнай медыцыне. Для традыцыйнага чалавека існуе стройная лінейка хваробаў з адпаведнымі сімптомамі, лекавымі алгарытмамі і, часта, вынікамі. Сярод аспектаў сімптаматыкі парушэння фізічнага або псіхалагічнага здароўя чалавека фігуруе і парушэнне сну: "*Начнічкі – гэта тожа загаварваюцца. Эта рабёнак не спіць цэлую ноч*" [14, с. 153]. Сон – маркер здароўя чалавека: *"– А эпілепсія, што за хвароба? – Бываіць ад іспуга. Знаю, што балезнь ад іспугу бывае…Не спіць чалавек, плачыць.*" [14, с. 316]. Класс хваробаў, дзе ў якасці сімптома выступаюць парушэнні сну, даволі шырокі. Так, напрыклад, начніцы: "*Ай, даўней былі, кажуць, і начніцы. У мяне первая дзяўчына, ды не спала… Начніцы, кажуць*" [14, с. 290]; плаксы: "*…гэто такая хвароба ў дзяцей, як яны не спяць да ўсё плачуць-крычаць*" [21, с. 333]. Цесна звязаны парушэнні сну і з уроцамі, падучай, дзяцінкай (дзецкай), старымі, крыксамі (крыктунамі). Упуд (перапалэх, ляк) таксама можна пазнаць па трывожным сне, ці ўвогуле яго адсутнасці: "*Дык гэтак я яго спужалася, гэтага чалавека… Дык ты знаеш, нядзелі дзве не спала."* [12]. Так, здараецца, калі парушэнне сну з'яўляецца вынікам наслаення некалькіх розных па сваіх праявах хваробаў адна на адну: "*Каўтун, кажуць, еслі чалавек улякнецца сільна… Ён (чалавек) мучаецца, галава баліць, бяссонніца*" [10]. Лекаванне вышэйназваных хваробаў ажыцяўляецца з дапамогай вялізнага масіву рытуальных і вербальных практык, разгляду якіх, у тым ліку і падзівнскіх, ужо прысвечана пэўная колькасць навуковых прац. Нам важна адзначыць тое, што сон выступае не толькі як сімптом хваробы, але ж і як сродак аздараўлення, "аднаўлення". Вялікая колькасць рытуальна-тэрапеўтычных дзеянняў выконваецца перад сном; адпаведна, што і "*…вадзічкі як дадуць (ад упуду –* аўт. *), тады і ў сон паклоніць сразу, і паспіш добра, усё харашо тагда*" [6]. Звязана гэта з феноменам сну. Так, сон успрымаецца у традыцыйнай карціне свету як інверсія смерці. Калі мець на ўвазе аналогію сну і смерці ў народным успрыняцці, то становіцца зразумелым адмысловае становішча нябожчыка ў прасторы хаты, якое вылучала і адлучала памерлага ад жывых. Мяжа выдзялялася не толькі ў тым, дзе і як ляжыць памерлы, але і ў тым, што ён "спіць" апранутым. Таксама, вера беларусаў Падзвіння ў прароцкасць сну пацвярджае, што сон ёсць канал камунікацыі паміж "гэтым светам" і "іншасветам". Нездарма вялікая колькасць варожбаў, як спосабаў зазірнуць у будучыню, выконваецца "на сон". У медыцынскай практыцы ж назіраецца накіраванасць на сімволіку адраджэння, ці выклікання "таго свету". Адсюль і заканамернае ўяўленне пра тое, што падчас сну хвароба ці адыйдзе ў "засветы", ці ўсё ж такі застанецца з чалавекам і прывядзе да смерці: "*Ну вот сматря як. Еслі ўжо пераспіць рабёнак, перамучаецца, то ўсё, шчыталі што будзець жыць"* [6]. Гэта звязана з адной асаблівасцю семіётыкі рытуалаў традыцыйнага чалавека. У выніку правядзення якога-небудзь абраду ажыцяўляецца стварэнне новай рэальнасці, выходны аб'ект пераўтвараецца ў новы, другі.

Працэс пераносу хваробы працуе і ў адваротны бок. Так, нярэдка сустракаюцца ў палявых запісах аповяды пра набыццё хваробы праз сон: "*І вот відзіць сон, ёй сасніўся: "Іду, а ля канавы плачыць дзіцёнак. Іду, а ён плачыць. Пастаяла, пастаяла і пашла глядзець гэтага дзяцёнка. А гэты дзяцёнак чорны, і ўверчаны ў чорным. І я гэтага дзіцёнка ўзяла і панясла". Каб яна яго хоць не ўзяла і не панясла. Дык пятнаццаць гадоў язва. Балее*" [15, с. 164–165].

Характар сну/бяссоння для беларусаў дае магчымасць судзіць пра век чалавека. Гэтая адметнасць дапаўняе фенаменальную афарбоўку сну ў традыцыйнай культуры. Яшчэ Нікіфароўскі ў сваім аглядзе

Віцебшчыны пісаў: “*Калі ўпершыню пакланае ў калыску дзіцяці хутка і спакойна засне, то яно не доўга пражыве.”* [20, с. 24]. Алегарычнае, сэнсетыўнае ўспрыняцце рэчаіснасці нараджае дзіўныя, мудрагелістыя і непаўторныя ўзоры традыцыйнай міфапаэтычнай карціны свету. Нават і сёння, звяртаючыся да гэтых зразумелых толькі ім ўзораў, вяскоўцы вераць у непахіснасць жыццёвага працэсу, наканаванасць усіх з’яў (як добрых, так і дрэнных, страшных), што, у сваю чаргу, змягчае стрэсавыя сітуацыі: “*І памёр. Сем гадкоў… Плакаў малец і плакаў, ночы не спала. Дзяўчаты былі добрыя, спакойныя, а малец… Можа ў яго век такі. Мала спаў, крыкам толькі.”* [9]. Не апошнюю ролю ў фарміраванні феномена сну грае эмацыйная складаная.

Трэба яшчэ выдзеліць і такую, у нейкім сэнсе асобную, катэгорыю адхіленняў, як летаргічныя сны. Летаргічны сон мае сувязь з т.зв.”абміраннямі”, угарэўшымі ці забітымі перуном людзьмі: “*Ай ну былі такія, што перуном заб’ець, а тада ў яму іх закапвалі, і некатарыя адхадзілі, но ні ўсе, мала хто*” [6]. Такія ж дзеянні рабіліся і з іншых прычын летаргіі: “*Ат угару кажуць, ці то ў зямлю ўкапаваць, каб адыягавали*” [7]. З’ява не ўпісваецца ў звычайны лад жыцця і мае анамальную афарбоўку. Само слова “летаргія” паходзіць ад грэцкага слова lethargia, што ў перакладзе азначае глыбокі сон, несвядомы стан. У медыцынскай практыцы пад летаргічным сном маюць на ўвазе хворы стан чалавека з больш-менш выяўленымі аслабленымі праявамі жыцця, які суправаджаецца нерухомасцю, значным паніжэннем абмену рэчываў і адсутнасцю рэакцый на розныя раздражняльнікі [5 с. 151]. Безумоўна, у паўсядзённасць дадзеная з’ява аніякім вобразам не ўпісваецца і ўспрымаецца носьбітамі традыцыі з недаверам. Фармальна ёсць факт смерці, знаходжання пэўны час на тым свеце, таму і аповяды пра выпадкі летаргіі будуюцца на спецыфічнай афарбоўцы : “*Ну вот эта там, кажуць, у западнай памёрла жанчына. І гэткі грукат, стукат, ну і сталі капаць. Сягоння пахаранілі, а заўтра ідуць на кладбішча, і гэткі гул там. Сталі капаць – ішчэ худшы гул. Ну і аткапалі – ажно там змей, абкруціў гэту жанчыну і гэдак хвастом біў… Ну а тады памёрлі і мужык з жонкай, угарэлі і памёрлі. Ну і тожа гул гэткі быў. Ну і хто капаць, хто – ні капаць, а можа гэткі самы абратна змей. Ну але ўсё-ткі сталі капаць.Укапаліся, кажуць, у палавіна магілкі, сціхла. Ну але ж ужо сталі адкапваць, ажно яны былі аджыўшы…Вот каб не гэны змей, так можа б раней сталі адкапаваць.*” [7]. Сярод аповядаў аб летаргічных снах часта сустракаецца сюжэт пра “аджыўшага” музыканта, якога пахавалі жывым і якому прыйшлося сваю прыналежнасць да жывых даказваць гульнёй на музычным інструменце [16, с. 201–202]. Так, тут прысутнічае элемент “выпрабавання” пры пераходзе назад з “іншасвету” у свет жывых, а самі героі аповядаў валодаюць якасцямі лімінальнага персанажу – пазбаўленага маркераў культуры. Цягам палявых даследванняў не было выяўлена стройнай сістэмы практык і прадпісанняў наконт летаргічных сноў, акрамя таго, што холад дапамагае чалавеку апрытоміць: “*Ну эта ў Ахвераўшчыне… дзве дзевачкі двайнючачкі ўгарэлі і памёрлі. Ну а там на кладбішчы каплічка была, ну вот як ужо ў цэркві пакойнік ні стаіць, тада ужо ў тую каплічку ставюць. Ну і гэтых дзяўчатак павязлі ў гэтую каплічку. А марозік бый, ну і снег, кажуць, пойдзем ужо рана іх глядзець, два гробікі зробілі. Ажно яны аджылі, іх адцягнула ў холадзі, і відаць, на парозі у гэтай капліцы сядзелі, і слядочкі – снегу падмяло, і яны, кажуць, у адным грабку абчапіліся і змёрзлі.*” [7].

Такім чынам, разгледзеўшы катэгорыі сон і бяссонне ў сістэме народнай медыцыны беларусаў Падзвіння, можна зрабіць наступныя высновы:

1. У традыцыі нармалёвы сон ёсць маркер нармалёвага здаровага стану чалавека.
2. У замоўнай практыцы катэгорыя “добры сон” і “здароўе” амаль прыраўніваюцца адна да адной.
3. Народная медыцына беларусаў Падзвіння мае вялікі масіў практык па лекаванню бяссоння, як проста вярбальных, так і рытуальных.
4. Як і іншыя хваробы, бяссонніца ў замоўных формулах часта персаніфіцыруецца.
5. Замовы-малітвы на сон уяўляюць сабой шырокую группу тэкстаў у шэрагу палявых матэрыялаў, сабраных на тэрыторыі Падзвіння, актыўна функцыянуюць у сучаснай традыцыі ў якасці асабістых абярэгаў нараўне з кананічнымі малітвамі, якія хрысціянская традыцыя прапануе чытаць перад сном.
6. Сярод сімптомаў шэрагу хваробаў (крыксы, начніцы, упуд, сурокі, калтун, старыя, падучая, дзяцінка і г.д.) фігуруе і парушэнне сну.
7. Сон выступае як сродак аздараўлення, “аднаўлення” чалавечага арганізму, што звязана з фенаменальным яго становішчам у традыцыйнай карціне свету, як то, напрыклад, канал камунікацыі паміж гэтым светам і іншым. Пацявярджаецца гэта палявымі матэрыяламі і наяўнасцю шэрага лекавых практык, якія ажыцяўляюцца менавіта перад сном.
8. Нярэдка сустракаюцца ў палявых запісах аповяды пра набыццё хваробы праз сон, што таксама звязана з феноменам сну ў традыцыйнай культуры.
9. Характар сну/бяссоння для беларусаў дае магчымасць судзіць пра век чалавека, пацвердзіць непахіснасць жыццёвага працэсу і тым самым змягчыць стрэсавыя сітуацыі.

10. У палявых этнаграфічных запісах сустракаюцца аповяды пра такую катэгорыю адхіленняў, як летаргічны сон. Звязваюць яго з “абміраннямі”, угарам, ударам перуна, пападаннем у віхор, але ж дзейснай практыкі па лячэнню народная медыцына не прапануе (акрамя адзінкавых дзеянняў).

ЛІТАРАТУРА

1. Валодзіна, Т.В. Народная медыцына / Т.В. Валодзіна // Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны : практ. кіраўніцтва / А. Сташкевіч [і інш.]. – Мінск : Ін-т культ. Беларусі, 2013. — С. 70–80.

2. Валодзіна, Т.В. Хвароба / Т.В. Валодзіна // Беларуская міфалогія: энцыкл. слоўнік / С.І. Санько [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – С. 530–531.

3. Вяргеенка, С.А. «На моры-акіяне, на востраве Буяне…» (лекавыя замовы Гомельшчыны) : фальк.-этнаграф. зб. / С.А. Вяргеенка; М-ва адукацыі РБ, Гомель. дзярж. ун-т ім. Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 220 с.

4. Вяргеенка, С.А. Хрэстаматыя : вучэб. дапам. па раздзеле “Замовы” для студ. спецыяльнасці 1-21 05 01 “Беларуская філалогія” / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. С.А. Вяргеенка – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2010. – 66 с.

5. Денков, В. На грани жизни / В. Денков ; пер. с болг. И. М. Сабуровой. — М. : «Знание», 1988. – 192 с.

6. Запісана аўтарам ад Дзям’янавай Лідзіі Ягораўны, 1939г.н., у в. Захарнічы Полацкага р-на Віцебскай в-ці, у 2010 г.

7. Запісана аўтарам ад Дрозд Соф’і Архіпаўны, 1935 г.н., у в. Мазуліна Ушацкі р-на Віцебскай в-ці, у 2009 г.

8. Запісана экспедыцыяй ПДУ ад Бубновай Ніны Віктараўны, 1932 г.н., у в. Рабчонкі Полацкага раёна Віцебскай в-ці, у 2006 г.

9. Запісана экспедыцыяй ПДУ ад Захаровіч Ганны Анісімаўны, 1922г.н.

10. Запісана экспедыцыяй ПДУ ад Кобы Ніны Кузмінічны, 1932 г., у в. Віляцічы Барысаўскага р-на Мінскай в-ці.

11. Запісана экспедыцыяй ПДУ ад Сваток Марыі Міхалаўны, 1941 г.н., у в. Бірулі Докшыцкага р-на Віцебскай в-ці, у 2009 г.

12. Запісана экспедыцыяй ПДУ ад Хілько Лідзіі Грыгораўны, 1926 г.н., у в. Бірулі Докшыцкага р-на Віцебскай в-ці, у 2009 г.

13. Лобач, У.А. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. А.У.Лобач, У.С.Філіпенка. – Вып. 1: Народная медыцына беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 1. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 148 с.

14. Лобач, У.А. Полацкі этнаграфічны зборнік / склад. А.У.Лобач, У.С.Філіпенка. – Вып. 1 : Народная медыцына беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2 – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.

15. Лобач, У.А. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 1. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 292 с.

16. Лобач, У.А. Полацкі этнаграфічны зборнік. – / уклад., прадм. і паказ. У.А. Лобача. – Вып. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння : у 2 ч. – Ч. 2. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 368 с.

17. Мур, Б., Психоаналитические термины и понятия / Б. Мур, Б. Файн // Библиотека Гумер [Электронны рэсурс]. – 2009. – Рэжым доступу : http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Psihol/Mur/26.php – Дата доступу : 12.03.2013.

18. Народная медыцына: рытуальна-магічная практыка. Беларуская народная творчасць / уклад., прадм. і паказ. Т.В. Валодзінай; навук. рэд. А.С. Ліс. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 776 с.

19. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский // Этнографические данные. – Витебск, 1895. – 684 с.

20. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах местах ... Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск, 1897. – 307 с.

21. Сержпутоўскі, А.К. Русальная нядзеля. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; літ. апрац. У.К. Касько. – Мінск : Вышэйш. шк., 2009. – 478 с.

22. Солопова, М.А. Возникновение науки о снах и сновидениях в Древней Греции / М.А. Солопова // Симпосий. Сайт об античной литературе, античной истории и людях античности. [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступу : http://simposium.ru/ru/node/10214. – Дата доступу : 12.03.2013.

**УДК 39.001**

## ЭВОЛЮЦИЯ ПРЕДСТАВЛЕНИЙ О ПРЕДМЕТЕ И ЗАДАЧАХ БЕЛОРУССКОЙ ЭТНОЛОГИИ В УЧЕБНОЙ ЛИТЕРАТУРЕ

***канд. ист наук, доц. С. А. ЗАХАРКЕВИЧ***
**Белорусский государственный университет, Минск**

*Проведен анализ эволюции представлений о предмете и задачах Белорусской этнологии в учебной литературе. Несмотря на достаточно широкие определения этнографии / этнологии, сформулированные в учебной литературе, в реальности предметное поле отечественной этнографии / этнологии*

Library.polotsk.su